*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!*
*ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ*



# НАША СЛОВА

Газета выходзіць з сакавіка 1990 года
№ 45 (936) 11 ЛІСТАПАДА 2009 г.

# Дыялог у ТБМ



3-га лістапада 2009 г. у сядзібе Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны адбылася сустрэча грамадскасці з дырэктарам Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі доктарам філалагічных навук, прафесарам Аляксандрам Аляксандравічам Лукашанцам. У сваім выступе А.А. Лукашанец закрануў пытанне пра складаныя абставіны развіцця беларускай мовы, грунтоўна распавёў прысутным аб усіх акалічнасцях фармавання яе сучаснай літаратурнай формы. Найбольшую частку сваёй прамовы Аляксандр Аляксандравіч адвёў для паведамлення пра тую працу, якая праводзілася навукоўцамі розных пакаленняў па працягу ХХ стагоддзя па ўнармаванні беларускага правапісу. Напрыканцы свайго выступлення А.А.Лукашанец закрануў асобныя акалічнасці і вострыя пытанні, што мелі месца пры выпрацоўцы змен, пакладзеных у аснову Закона аб правапісе беларускай мовы, які ўступіць у дзеянне з верасня 2010 года. Час, запланаваны для сустрэчы, праляцеў хутка. Таму і прысутныя, і А.А. Лукашанец дамовіліся аб тым, каб правесці яшчэ некалькі сустрэч, прысвечаных разгляду канцэптуальных змен у правапісе. Папярэдне дамоўлена, што гэта будзе першы аўторак снежня.

Трэба дадаць, што сустрэча была запланавана ў межах дзеяння праекта "Дыялог", які наша арганізацыя выконвае пры фінансавай падтрымцы Дзярждэпартамента ЗША, і які быў зарэгістраваны ў Дэпартаменце па гуманітарнай дапамозе Рэспублікі Беларусь напярэдадні 20-годдзя ТБМ. Нагадаем, што сустрэчы з навукоўцамі, краязнаўцамі і рознымі вядомымі людзьмі, а таксама паседжанні дыскусійнага клуба праходзяць кожны аўторак з 19 да 21 гадзіны.

Так, 10 лістапада пройдзе пасяджэнне моладзевага дыскусійнага клуба "Эканамічнае развіццё Беларусі" з удзелам у якасці асноўнага выступоўцы і эксперта Яраслава Раманчука, 17 лістапада – завочнае падарожжа "Мясцінамі Адама Міцкевіча" з удзелам навукоўца Вячаслава Раковіча, а 24 лістапада плануецца сустрэча з вядомым знаўцам звычаяў і традыцый беларусаў Антанінай Хатэнка.

Чакаем вас у нашай сядзібе па вул. Румянцава, 13 штоаўторак з 19 да 21 гадзіны.




*Кіраўнік праекта "Дыялог", намеснік старшыні ТБМ* ***Алена Анісім.***

ISSN 2073-7033

**13 лістапада на сядзібе ТБМ па вул.Румянцава, 13 адбудзецца сустрэча з намеснікам старшыні ТБМ, старшынёй Менскай гарадской арганізацыі ТБМ Аленай Анісім.**
**Тэма сустрэчы:**
***"Дзейнасць Таварыства беларускай мовы ў юбілейны год: здзейсненае і задуманае".***
**Сустрэча ажыццяўляецца па лініі агульнанацыянальнай кампаніі "Будзьма беларусамі!"**
**Чакаем усіх а 18 гадзіне.**

# 260 гадоў з дня нараджэння Мацея Радзівіла

**РАДЗІВІЛ** Мацей (10. 11.1749 - 2.9. 1800), дзяржаўны дзеяч ВКЛ, кампазітар, драматург. Сын Л.М. Радзівіла. Атрымаў хатнюю адукацыю ў Нясвіжы. З канца 1770-х г. зблізіўся з віленскім ваяводам К.С. Радзівілам Пане Каханку. Падкаморы ВКЛ у 1786—90, кашталян віленскі з 1790; пасол на сойм 1780. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1792 перадаў у распараджэнне войска ВКЛ замкі, арсеналы і радзівіл-лаўскую міліцыю, якімі распараджаўся як апякун малагадовага Д.Г. Радзівіла, за што атрымаў спец. падзяку ад Чатырохгадовага сойму 1788-92. Удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання 1794, уваходзіў у склад Найвышэйшай літоўскай рады (чал. дэпутацыі публічнага скарбу). Дараваў асабістую волю сваім сялянам, якія прымалі ўдзел у паўстанні. У кастр. 1794, занепакоены радыкалізацыяй паўстання, выехаў у Га-лічыну. Апошнія гады жыцця правёў у сваім маёнтку Паланэчка (Наваградскае ваяв.), які на пэўны час стаў культ. асяродкам у краі. Як драматург дэбютаваў у 1784, калі да прыезду караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў Нясвіжы была пастаўлена опера «Агатка, або Прыезд пана» (лібрэта Р., музыка Я.Д. Галанда). Пазней опера ставілася ў Варшаве, Любліне, Вільні, Львове; з 1799 выконвалася ў 2-актавай версіі над назвай «Добры пан — бацька для падданых» і карысталася папулярнасцю да канца 1820-х г.



Валодаў маёнткамі ў Літве і Польшчы, на Беларусі — Паланэчкай, Крошынам і інш. У шлюбе з Эльжбетай Хадкевіч меў дачку і сына Канстанціна.

# Паэт-сатырык, пісьменнік, літаратуразнавец, музеязнавец

### *Да 75-годдзя з дня нараджэння Івана Курбекі*

**КУРБЕКА** Іван Сцяпанавіч нарадзіўся 10 лістапада 1934 года ў вёсцы Серабрышча Баранавіцкага раёна Берасцейскай вобласці. З сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Моўчадскай СШ Іван Сцяпанавіч у 1953 годзе паступіў на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, якое паспяхова закончыў у 1958 годзе. У яго працоўнай кніжцы ёсць толькі два запісы пра яго працоўную дзейнасць: з 1958 года ён навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Янкі Купалы і з 1964 года навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела, старшы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Якуба Коласа (цяпер Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа).

Літаратурную дзейнасць Іван Сцяпанавіч пачаў у 1958 годзе. ¨н актыўна выступаў у перыядычным друку, на радыё і тэлебачанні, прапагандуючы творчасць класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. І не толькі пра іх, але і пра іх сваякоў, і бліжэйшае іх акружэнне.

¨н аўтар зборніка гумарыстычных вершаў "Абы здароўе" (1979), кнігі лінгвістычных загадак (шарады, метаграмы, лагарыфы, анаграмы) "Хітрыя літары" (1991), зборніка "Руска-беларускія крыжасловы: Займальны дапаможнік для ўдасканалення мовы" (1993), альбомаў для выставак у школе "Янка Купала" (1965, 2-е выд. 1983), "Якуб Колас" (1967, 2-е выд. 1980, у сааўт.), альбома "Якуб Колас: Жыццё і творчасць" (1974, у сааўт.). ¨н укладальнік зборніка "Успаміны пра Якуба Коласа" (1982).

Творы Івана Сцяпанавіча былі змешчаны ў калектыўных зборніках "Асцюкі за каўняром" (1989), "Вожык смяецца" (1992) і інш. ¨н друкаваўся ў часопісе "Вожык", штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва", "Вячэрнім Мінску" і іншых перыядычных літаратурных выданнях. Апошняя яго кніга выйшла ў 2008 годзе – "Запрашэнне ў музей". Гэта, можна сказаць, была яго "лебядзіная песня". Кніга атрымалася цікавай і змястоўнай. Гэта быў прыкметны ўнёсак Івана Сцяпанавіча ў развіццё музеязнаўства ў Рэспубліцы Беларусь.

Іван Сцяпанавіч – аўтар шматлікіх літаратурна-крытычных артыкулаў, успамінаў пра тых постацей, з якімі ён сустракаўся. А сустракаўся ён і сябраваў з вядомымі асобамі нашай эпохі: Алесь Адамовіч, Заір Азгур, Анатоль Багатыроў, Рыгор Барадулін, Пятрусь Броўка, Генадзь Бураўкін, Васіль Вітка, Артур Вольскі, Анатоль Вялюгін, Пятро Глебка, Кандрат Крапіва, Аркадзь Куляшоў, Максім Лужанін, Міхась Лынькоў, Янка Маўр, сям'я-радня Якуба Коласа і сям'я-радня Янкі Купалы, Алесь Пальчэўскі, Янка Скрыган, Іван Шамякін, Станіслаў Шушкевіч, Рыгор Шырма, Алесь Якімовіч і многія-многія іншыя.

Яго сатырычныя вершы ўражваюць дасціпнасцю, уменнем абыграць любую прыродную з'яву, нечакана па-новаму перафразаваць чужое выказванне ці думку свайго суразмоўцы. Прырода надзяліла яго тонкім гумарам, талентам імітацыі, падробкі індывідуальных галасоў – Пятруся Броўкі, Янкі Маўра, Рыгора Шырмы, Івана Шамякіна і інш. Іван Сцяпанавіч лічыў, што яго сатыра і тонкі гумар перайшлі да яго ад бацькі Сцяпана.

Каля 50 гадоў Іван Сцяпанавіч працаваў на ніве музейнай справы, жывым майстэрскім словам ушаноўваў памяць народных песняроў Янку Купалу і Якуба Коласа ў самых розных аўдыторыях краіны: вучонных, пісьменнікаў, дзеячаў культуры, рабочых, сялян, вучняў, воінаў Савецкай арміі Рэспублікі Беларусь. На сотнях фотаздымкаў яго выява з выдатнымі дзеячамі нашага часу Савецкага Саюза і Рэспублікі Беларусь, краінаў Заходняй Еўропы.

Іван Сцяпанавіч раптоўна памёр 1красавіка 2009 года. Пахаваны на радзіме каля сваіх бацькоў і радні.

***Анатоль Валахановіч,***
*пісьменнік, гісторык.*